


друкаПІСны оОРГан ваКАЛьна-інСтРУмэнтальнага ансамБЛЯ

# ЗАСРАЛІ КАЗАРМУ

## ПРЫВІТАНЬНЕ

Вось і прайшло некалькі месяцаў з часу выхаду першага нумару нашай газэткі. Мяркуючы па водгуках чытачоў, атрымалася ПОЎНАЕ ГАЎНО, на што мы, уласна кажучы, і спадзяваліся. Мусім вас узрадаваць: гэты нумар атрымаўся яшчэ больш гаўняны.

Вы, напэўна, думаеце, што раз газэта гэты час не выходзіла — значыцца, мы нічога і не рабілі. Не фіга падобнага! Дрэнна ж вы, аднак, пра нас думаеце! Увесь гэты час мы вельмі нават плённа працавалі, напісалі некалькі новых песенек і зрабілі аранжыроўкі старых. Падчас выступленьняў намі былі засраны: 1) Менскі педунівер імя М.Танка (2 разы!), 2) Зялёны флігель у Лошыцы (2 разы!), 3) Star-club (ён жа Pall Mall), 4) Беларускі гуманітарны ліцэй імя Я.Коласа; 5) яшчэ адзін ліцэй, які на вул. Якубава; 6) ну і, вядома ж, ДК «Юнацтва», у якім адбываўся фэстываль «Супкультура 01'2002». Пра некаторыя з гэтых акцыяй чытайце на старонках «Белачкі» №2.

Мда, хіба ж да газэты нам было, калі навокал столькі цікавых спраў? Да таго ж, акрамя «Белачкі», удзельнікі нашага гурта выдаюць яшчэ два выданьні, прычым больш наварочаныя, — часопісы «Васковыя могілкі» (ех «Сельское кладбище») і «Хню». Набыць іх можна, звярнуўшыся на нашу адрасу →

220009, Беларусь, г.Мінск, а/с 108, Віктару Жыбулю.
E-mail: buslik@tut.by



### ВЫЧВАРЭНЦЫ Ў МАКДАБЛЕ

Тое, што макдональдс – гэта вычварэнцы, ведаюць усе, нават у дзіцячым садку (панкаўскім, вядома ж). Але няма межаў дасканаласці і няма такога вычварэння, якое б нельга было вычварыць яшчэ больш. Патлумачу сутнасць справы.

Заходжу я, значыцца, неяк у Макд... з цвёрдай мэтай салодка пасраць. Выстойваю чаргу (пры гэтым людзі з прыбіральняў выходзяць чамусьці па двое: мамы з малымі дзецьмі; ну, гэта яшчэ нічога), забураюся ў кабінку і дзверы прычыняю даволі, здаецца, надзейна. Ну, думаю, зараз засру гэтую д'яблаву казарму. І тут раптам дзверы з груканнем адчыняюцца! З-за іх пазірае на мяне нахабны дзесяцігадовы даун. "Гаўнюк шаноўны, -- кажу, – твая прыбіральня побач". А ён не разумее! У Брэсцкай крэпасці, напэўна, было нешта падобнае. Дзверы пасля гэтага ўвесь час нехта спрабаваў штурмаваць. Калі я ўрэшце адтуль выйшла, пабачыла штук 5 вялікіх ужо хлопчыкаў і яшчэ кагосьці – напэўна, іх выхавацельку. Паводле аператыўных дадзеных, дакладна ў гэты ж час у мужчынскай прыбіральні не было нікога.

Пытанне гэтае трэба ставіць і вырашаць неадкладна. Што вырасце з хлопца, які наведвае жаночыя прыбіральні, а можа, нават ніколі ў жыцці не бачыў пісуар?! Підарас вырасце! Ня йначай. Ці гэтага мы хочам для сваёй нацыі? Альбо мы ўжо даўно перарабіліся ў даўнаў-підарасаў?

**Джэці**

## "БІ СКІНОЎ, РАТУЙ КІТАЙЦАЎ!"

Нігеры ў нас ёсьць, але вельмі мала. Кітайцаў крыху больш, але ўсё роўна на ўсіх скіноў кітайцаў не хапае. Таму нашыя скіны занятыя вельмі высакароднай справай: зачысткай гораду ад белатварых таварышаў, якія ці то падобныя нечым да асобаў не тае што трэба нацыянальнасьці, ці то папросту ня лічаць сябе перад скінамі гаўном. у сувязі з гэтым грамадзянам катэгарычна забараняецца:

- насіць цюбецейкі, кепкі і на ўсялякі выпадак акуляры *(а яшчэ – доўгія валасы ды іракезы – заўвага рэдактара)*;
- адварочваць ніжні край джынсаў;
- апранаць белыя курткі і рэперскія шырокія штаны;
- слухаць рэп *(і альтэрнатыўную музыку ў любым выглядзе – заўвага рэдактара)*;
- фліртаваць з бландынкамі;
- размаўляць;
- дыхаць;
- існаваць.

У адваротным выпадку можна моцна атрымаць па сківіцы, носе, воку, нырках і г.д., у залежнасьці ад настрою санітараў лёсу. У сувязі з гэтым уношу прапанову зрабіць зьмены ў дэклярацыі правоў чалавека. Так, папершае, дазволіць усё тым, каму што-небудзь забараняць ня мае сэнсу. па-другое, дазволіць мірным грамадзянам вынішчаць шкодных скіноў, якія робяць сорам сваёй дзяржаве, свайму гораду, сваім сем'ям і сваім чорным курткам ды дурным паголеным галовам. Альбо зачыніць іх разам з даўнамі, каб тыя пакрэмзалі іх на сваіх такарных варштатах. Гэта нават вельмі гуманна.



ДжэцЁ

*P.S. Але гэта не датычыцца тых нешматлікіх чырвоных скіноў, у якіх усё ж такі галовы не пустыя – заўвага рэдактара).*




ПОЭМА О ЗДОРОВЬЕ

ЗАПІСКІ З ЗАЛЫ

Як утварылася ваша група? І раскажыце трохі пра сябе

Якая ваша любімая група



На жаль, аб'ём нашае газэты не дазваляе грунтоўна распавесьці ні аб гісторыі нашага гурта, ні, тым больш, аб сабе, таму пра гэта – чытайце ў наступных нумарах Бел@чкі. Скажам толькі, што тэледупікі вельмі любяць адно аднаго. Што да любімых гуртоў, то:
Віктар Ываноў – АГАТА КРИСТИ;
Віка Трэнас – таксама;
Ленін, Джэці – CRADLE OF FILTH, ВЫХОД, РАЦИОНАЛЬНАЯ ДИЕТА, АУКЦЫОН, КРАДЕНОЕ СОЛНЦЕ – EINSTÜRZENDE NEUBAUTEN
Шурык - КАРЫСНЫЯ ВЫКАПНІ
Таня – усяго патроху (гурт такі)

Дык, усё такі, як шыфруецца назва вашага гурта?

Наша назва ZASRKAZR запазычана з сатурніянскае мовы і перакладу не падлягае, хаця некаторыя паліглоты сьцьвярджаюць, што яна перакладаецца як СОНЕЧНАЯ САВА. Але нас такі варыянт не задавальняе.

Ці набілі вы рэкорд па наведванні вашых канцэртаў?

Зь якога боку?

Якому музычнаму стылю належаць вашы творы?

Арт-панк: хто – за?
Ніхто.
Значыць, не арт-панк.
Брут-поп: хто за?
Маўчаньне...
Значыць, не брут-поп.
Гэй, крытыкі!..
Шкада, Прымакі не было.



Ці спяваеце вы пра што-небудзь сур'ёзнае?

Так, вядома ж. У адным з нашых новых альбомаў будзе прэпараваны Шапэн.

Які дыягназ вам паставіў ПСІХІЯТР?...

Віктар Ываноў – аўтызм, пачатковая стадыя шызафрэніі, неўраўнаважанасьць, паранойя і г.д.;
Віка Трэнас – самнамбулізм;
Джэці – разьдзесяцярэньне асобы, манія велічы;
Ленін – латэнтная нэкрафілія;.
Шурык – к арміи годенъ; значитъ, просто симулянтъ;
Косьця – ломка, запой;
Таня – усё астатняе.
А ўвогуле, сярод нас нават коцікі ёсьць!

Што вас звязвае з Кожухам Зміцерам

Прабачце, калі ласка, а хто такі Кожух Зміцер?

Якім чынам вы трапілі да нас, калі вы не ведаеце Зміцера Кожуха?

У фортку заляцелі. Мы ж сатурніяне.

А можна папрасіць асобу коціка праявіць сябе?

МЯЎ!

Ваш гурт называецца
„Засрані казарму“



Як цудоўна, што сярод вас ёсьць сапраўды эрудыраваныя, музычна прадвінутыя людзі, якія добра ведаюць сучасную беларускую музыку і якім зусім не абыякава, на чый жа канцэрт яны прыйшлі. Можам за вас толькі парадавацца!





Руку да нагі



З сусвету ід.
Кварта

Вой, а гэта што? А, ёлы-палы, гэта Джэці складала сьпіс вершаў, якія трэба чытаць. М-да, без шпаргалкі мы і дасюль не абыходзімся...



ТЭКСТЫ ПЕСЕНЪ ЗАСРАЛІ КАЗАРМУ

## ТЭКСТЫ ПЕСЕНЬ ГУРТА "ЗАСРАЛІ КАЗАРМУ"

### МАНЬЯКІ

(муз. ЗК – сл. Антынародныя)

Па лесе блукае маньяк-заафіл.
Ніхто не завые, не каркне ў кустах –
зьвяроў ахапіў ліхаманкавы жах,
схаваўся глыбока ў раку кракадзіл.

Прыпеў: Па лесе блукае маньяк. > 2 р.

Па могілках ходзіць маньяк-нэкрафіл,
палюе на тых, хто адкінуў канькі.
Ды ціха, як мышы, ляжаць мерцвякі,
баяцца вылазіць з утульных магіл.

Прыпеў: Па могілках ходзіць маньяк.

Па школе вандрue маньяк-пэдафіл,
усіх запрашае наведаць спортклюб,
а дзеці ў адказ толькі носам хлюп-хлюп,
і кожны прыкідваецца, што дэбіл.

Прыпеў: Па школе вандрue маньяк.

Па горадзе крочыць маньяк-натурал –
пісьменьнік, музыка, мастак, тэатрал.
Не бойцеся, трупы, жывёлы і дзеці:
маньяк-натурал – самы лепшы на сьвеце!

Прыпеў: Па горадзе крочыць маньяк.

Па лесе блукае маньяк-заафіл.
Па могілках ходзіць маньяк-нэкрафіл.
Па школе вандрue маньяк-пэдафіл.
Маньяк-натурал – самы лепшы на сьвеце!

### ЮГАРЫ

(муз. і сл. B.R.D. Sander'а)

Калі цёмна на двары,
Дык прыходзяць югары,
У іх рукі – быццам чэрві,
У іх вочы – нібы бельмы.
За сабой яны паклічуць –
уцякай хутчэй.

Югары дастануць торбы,
Выцягнуць твае вантробы,
І табе яны удзячны,
Іх сьняданак будзе смачны.
За сабой яны паклічуць –
уцякай хутчэй...

А на ранку, на світанку
Трэба ім хутчэй хавацца
І на могілкі вяртацца
Да зары, да зары.
Калі цёмна на двары,
Дык прыходзяць югары.
Уцякай, уцякай, югароў не чакай,
у-ця-кай!

### А ДЗЕ ЖАБА?!

(муз. B.R.D. Sander'а – сл. Ул.Карызны)

Даўгацыбы, даўганосы
Бусел жабу пераносіў.

Па балоце ішоў
Каля купін, каля карчоў.

Э! А дзе жаба?
А дзе жаба? Э!

Вады ў боты набраў,
Кашулю парваў.
Стаў ваду з ботаў выліваць,
Умудрыўся порткі парваць!

Э! А дзе жаба?
А дзе жаба? Э!

Калі зашываў рыззё,
Прышыў да сябе крысо,
Не можа разагнуцца ніяк.
Калі ж разагнуўся бядак,
Есці, есці, есці захацелася,
А куды, а куды жаба падзелася?
Есці, есці, ес-ці-і...

### MARAT KAZEY

(муз. і сл. Джэці)

Гонар хлопчыку Марату
Marat Kazey's our hero
Атрымаў фашыст гранату
Marat Kazey made him zero

Прыпеў: Bombs are exploding
Over a head,
Marat Kazey's
Never dead.

Адзін фашыст залез на дрэва
Marat Kazey lives forever
А вартавыя збеглі з паста
Marat Kazey superstar

Прыпеў.

Усім астатнім быў .....ец
Marat Kazey kills skinheads
А каму недастаткова
Marat Kazey is over and over
And over and over and over
Again!

Прыпеў: Бомбы рвуцца ў галаве
Марат Казей заўсёды
жыве

Marat Kazey
made me crazy!

### АРАНЖАВЫ ПАНОС

(муз. і сл. B.R.D. Sander'а)

У гэтым доме няма прыбіральні
а ў прыбіральні няма ўнітазу
а ва ўнітаза няма ручкі
а ў ручкі вяровачкі няма

Прыпеў: Але мне на ўсё гэта насраць
аранжавым паносам!
аранжавым паносам
паносам
аранжавым

У гэтай краіне няма ўлады
а ва ўладзе няма прэзыдэнта
а ў прэзыдэнта няма чорных вусоў
а ў вусах няма блох і клапоў

Прыпеў:

### ВОСЕНЬ

(муз Джэці – сл. В.Ыванова)

Я прыехаў у госьці да Вані:
– Адчыняй-ка, вішую, Ванюша!
Ну а Ваня шкарпэткі здымае.
Я нюхнуў – непрытомны валюся.

Прыпеў:
Надыходзіць ванючая восень –
Гэта Ваня шкарпэткі здымае.

Але я, самляваючы, здолеў
Ад душы яму ў морду заехаць.
Сука-Ваня дагэтуль са столі
Адшкрабае аскепкі шкарпэтак.

Прыпеў:

Там, дзе людзі не грэбуюць мыцца, –
Там краіны адвечнага лета.
Ну а ў нас весь такая зімішча
З-за Іванавых супэршкарпэтак.

Прыпеў:

### МАМІНЫ ГЛЮЗА

(Муз.В.Ыванова, ЗК і яшчэ кагосьці – сл. В.Ыванова)

Я шёл по дной дороге, я шёл по загородной дороге и вдруг поднял глОЗа.
Это были мамины глОЗа.

Припев:

Бывает в жизни всё
И кое-что ещё,
Они нас постоянно развращают,
А мамины глОЗа,
Ах мамины глОЗа
Вовремя обратно нас рожают...

Иду я дальше. Слышу
за спиною голоса -
Ещё бы, у меня теперь вместо яиц
глоза.
Само собою мамины глОЗа.

Припев:



*ДЖЭЦІ*

# АЎРОРА ДЫКТУЕ ДЭКРЭТЫ

***(Дадатак да тэорыі эвалюцыі)***





З першым залпам
(пачаткам
падзей)
Усім малпам
Ператварыцца у
людзей!

**З другім
(зусім неблагім)
Кожнаму хутару –
Па кампутару!**

З трэцім –
Джойстыкі
Усім дзецям!

Залп чацвёрты –
Самы вясёлы.
Няхай ва ўсіх коняў
Замест ног будуць
колы.
Фабрыкі –
працаўнікам!
Зямлю –
мерцвякам!





Залп пяты,
Злы і калматы.
Няхай загінуць
дэгенераты.



А з
астатніх кожнай
тварыне –

Па чорнай
скрыні.

Залп шосты,
Неверагодна
просты.
Кожны на сняданак
Атрымае тосты.

Залпы з
семага па
трынаццаты
адной чаргой
–
Гэта не
расстрэл
І не
міжусобіца.
Гэта проста
ад захаплення
Ўсім, што
робіцца.



**Пасля
чатырнаццатага стрэлу
Ўсім атрымаць
скафандры
і самастрэлы.
Гэта не жарт і не
фарс.
Мы сапраўды
паляцім на Марс.
Будзем там жыць
земляробствам
і паляваннем
І кампутарным
махляваннем.
А хто не згодны –
Свабодны,
Дакладней,
арыштаваны.**



**<u>Залп
пятнаццаты,
Самы
доўгачаканы.
Кожнаму
ўвайсці у
персанальную ракету,
Сканструяваную
найвялікшым
геніем сусвету.
Кіраванне
ракетай прасцей
за шкло у яе
вакне.</u>**

Залп шаснаццаты.
Павярнуцца спіной
да
дзіркі у сцяне...
Залп сямнаццаты.
...На старт!
Увага!..
Залп
васемнаццаты...
...Фарт!!!



28.VIII.2001.

(Гэта таксама і
своеасаблівы
паэтычны дадатак
да нашага славутага
падручніка
фарт-музыкі.
Сам падручнік
вы зможаце
прачытаць у
наступных нумарах
нашай газэткі.
Тым жа, хто
наогул ня ведае,
што такое фарт,
раім паглядзець
«Белачку» №1.)



# ПИСЬМО СЧАСТЬЯ

Само письмо находится в Голландии. Оно обошло 146 раз вокруг света и попало к Вам. С получением письма его надо послать тому, кому Вы желаете Счастья, даже если Вы не поверите в Счастье из параллельных миров, все зависит от Вас. Жизнь письма началась в 1254 году. В Россию оно попало в начале XX века. Письмо получила бедная крестьянка Цигунова и через 4 дня откопала клад, потом вышла замуж за князя Голицина и стала миллионершей. В 1943 году письмо попало к маршалу Тухачевскому, который сжег его. Через 4 дня его арестовали, осудили и расстреляли. В 1921 году Конан Дойм получил письмо и не распечател его. Он попал в катастрофу и ему ампутировали обе руки. Хрущеву письмо подбросили на дачу. Но т.к. он не прочитал его, то на 4 день он был свергнут своими друзьями. В 1980 г. Алла Пугачева сделала 20 копий и через 4 дня получила неожиданное предложение от фирмы, после чего через 4 месяца положила на лицевой счет 20 тысяч долларов США. Примеров очень много. Ни в коем случае не рвите письмо. Отнеситесь к этому серьезно. Это путь между настоящим и будущим. Письмо можно отправлять в конверте, лишь бы оно дошло до адресата. Текст письма не изменять.

у6181518Е6:XX11XX1LL15X – эти знаки принесут Вам счастье на 9 лет. Это письмо обошло вокруг света. Счастье должно посетить Ваш дом. Отправьте его лицам, которые в нем нуждаются, не посылайте денег – счастье не покупается, не задерживайте письмо более 96 часов. Эта цепь создана миллионерами Венесуэлы. Отправьте письмо приятелям и 4 дня ждите сюрприза.

Данте получил письмо в 1920 году. Поручил своему секретарю отослать 20 копий, через несколько дней он получил 20 тысяч долларов. З.Дорозе получил письмо, но не отправил. При родах умерла его жена, родив больного сына. Через несколько дней Дорозе отправил несколько писем, обреченный малыш выздоровел. Сделайте 20 копий. Отправьте обязательно, ждите сюрприза. С любовью все возможно. Это письмо удачи обошло весь мир 9 раз. Удача послана тебе, она посетит тебя в течение 4-х дней со дня получения письма. Удача избрала тебя на своем пути. Это не шутки. Ты получишь удачу, не высылая денег. Вышли копии людям, нуждающимся по твоему усмотрению. Не высылай денег, судьба не имеет цены. Не храни это письмо, оно должно оставить твои руки в течение 96 часов.

Служащий авиакомпании получил 70 тысяч долларов. Джан Оли получил 40 тысяч долларов. Потерял их потому, что прервал цепочку. Джорж Биссон получил письмо, потерял жену, т.к. не смог дать письму новые связи. Однако перед смертью он получил 750 тысяч долларов. Пожалуйста, разошлите 20 копий и ожидайте, что произойдет через 4 дня.

Цепочка идет из Венесуэлы и написана св. Антонием Трибэле, миссионером из Южной Америки. Поскольку эта копия должна путешествовать по миру, сделайте 20 копий и пошлите их друзьям, «Объединениям». Через несколько дней ты получишь сюрприз, это правда, даже если над тобой довлеют суеверия, обрати внимание на следующее:

Константин Джас получил письмо в 1980 году. Он попросил своего секретаря сделать 20 копий и разослать их. Несколько дней спустя он выиграл 2 млн. долларов. Даллас, служащий, получил письмо и забыл, что должен избавиться от него в течение 96 часов. Он потерял работу, потом, отыскав письмо, сделал 20 копий, несколькими днями позже он получил работу лучше прежней. Дорый Фрейранд получил письмо и не поверив, выбросил его, 9 дней спустя он умер. В 1987 году письмо получила молодая женщина из Калифорнии, оно было весьма потрепанным, читалось с трудом. Девушка обещала, что перепечатает его, но отложила, чтобы сделать это позднее. На нее свалилась масса проблем, включая дорогой ремонт автомобиля. Письмо не покинуло ее руки в течение 96 часов. Наконец она переписала письмо как обещала и получила новую машину.

Помни, не посылай деньги. Не игнорируй письмо. Прими его.

ТЫ ПОЛУЧИШЬ УДАЧУ